# Нячысцікі

# Апівень

Нячысцік, які чапляецца да людзей, схіляючы іх да п’янства. Прысутнічае на ўсіх бяседах, сочыць, хто з прысутных колькі п’е, падбухторвае не надта пітушчых выпіць паболей. Калі гэта не ўдаецца, падсыпае ў чарку нейкага зелля, каб чалавек зрабіўся зусім п’яным. Апівень забаўляецца з п’янымі: дражніць і скідвае іх пад стол. Яго выгляд спалучае заамарфныя і антрапаморфныя рысы. Гэта невялічкая істота, парослая цёмнай рэдкай поўсцю. Галава па форме чалавечая, але са свіным рылам, на месцы броваў тырчаць маленькія рожкі, хвосцік, як у парсючка, закручаны, ножкі з капытцамі. Ходзіць проста або ракам. Кажуць, што ніводны п’яніца не здольны перапіць Апіўня, бо нячысцік не хмялее, колькі б ні выпіў.



# Багнік

Нячысцік, што жыве ў тарфяным балоце, якое мае выгляд чорнай бруднай лужыны, не пакрытай раслінnасцю. Ён ніколі не выходзіць на паверхню балота, толькі часам нагадвае пра сябе бурбалкамі атрутнага газу ды зрэдку дробнымі агеньчыкамі. Цёплае пыханне багніка саграваe твань і не дае ёй замёрзнуць. Багнік, як і іншыя балотныя нячысцікі, не баіцца перуновых стрэл, бо яны страчваюць сваю сілы пры дотыку да паверхні балота. Але пры пажарах ці калі твань вычэрпваюць на ўгнаенні, багнік ледзь жывы ляжыць на дне і чакае дажджу. Выглядае багнік як таўстун без вачэй, брудны, сляпы.



# Балотнік

Страшэнны таўстун, зусім без вачэй, увесь у тоўстым пласце бруду, да якога наліпла багавінне, мох, смаўжы, жукі ды іншая вадзяная жамяра. Прыгожымі вобразамі і гукамі яны заманьваюць ахвяру ў дрыгву, а калі яна пачынае тануць, нячысцік паволі цягне яе за ногі. Таксама не баіцца Перуна, але пакутуе ад асушэння балотаў. Паміж кветкамі і ягадамі балотнік патаемна вырошчвае багун, каб затуманіць розум, прабівае балотныя вакенцы.



Так уявіў балотнага духа мастак

П. Славук

# Валасень

Хатні дух, які ўначы трывожыць і пужае людзей у сне. Уяўляўся невялікай істотай, парослай цёмнай густой і доўгай поўсцю, з сяміпалымі далонямі і доўгімі пазногцямі. Ён ходзіць выпрастаўшыся. Мужчынам казыча насы і драпае кіпцюрамі па твары, жанчынам кудлаціць валасы, хапае іх за грудзі ці навальваецца ўсім целам. Палохае і дзяцей: дудзіць ім у вушы, казыча пяткі.



# Валасень

# Гаёўкі

Міфічныя насельніцы лясоў і гаёў. Маляваліся ў выглядзе маладых гарэзлівыз дзяўчат. На зіму яны пакрываюцца тоўстай белай поўсцю, чыстымі застаюцца толькі твар ды русыя косы. Яны любяць усё жывое, лекуюць лясных жывёлаў. У час небяспекі могуць рабіцца нябачнымі. Гаёўкі падглядаюць за вясковымі забавамі, калі ўпадабаюць сукенку якой-небудзь дзяўчыны, могуць яе скрасці, пакінуўшы дзяўчыну голай. На купальскую ноч гаёўкі ходзяць любавацца на цвіценне папараць-кветкі, таму той, хто прасочыць за гаёўкамі, можа знайсці кветку шчасця.



# Кікімары

Міфічныя істоты, што жывуць па сядзібах. Сваё паходжанне бяруць ад дзяўчатак, што памёрлі да хрышчэння альбо былі праклятыя маткаю яшчэ ў чэраве. Кікімары заўсёды знаходзяцца ў юначым узросце. Хоць кікімары дасылаюцца да людзей з варожымі мэтамі, яны застаюцца зусім бясшкоднымі. Яны застаюцца часцей за ўсё ў дамах, дзе забілі ці праклялі дзіцёнка. Калі спаймаць кікімару і выстрыгчы ў яе на цемені валасы крыж-накрыж, яна назаўсёды застанецца чалавекам. Яны растуць, як звычайныя дзеці, але ў іх заўжды ёсць пэўныя недахопы: непрапарцыянальнасць фігуры, слабы розум.





# Кладнік, кладавік

Дух, які валодае скарбамі і ахоўвае незлічоныя багацці. Апранаецца ў срэбную світку з залатым поясам, на галаве носіць канічную шапку з літога золата. У руках трымае срэбны кій з залатымі булдавешкай і наканечнікам. Уся хата кладніка ззяе ад каштоўных камянёў і золата, але нячысцік праз сваю сквапнасць не бярэ і драбніцы на харчовыя патрэбы, таму заўсёды галодны і худы. Кладнік не любіць ні іншых нячысцікаў, ні людзей, бо баіцца, што яны скрадуць яго багацце. Калі хто-небудзь шукае клад, ён выстаўляе яго бліжэй да зямлі, каб шукальнік заключыў здзелку з нячысцікам. Калі ж хто-небудзь хавае скарб, кладнік цягне золата глыбока пад зямлю. Зрэдку нячысцік выстаўляе клад для праветравання, і гэты момант можа стаць зручным для захопу багацця.

# Дамавік



# Ёўнік

- Сядзібны дух, які жыве ў еўні, у печы ці на печы. Блізкі сваяк Лазніка, з якім яднаецца вогненным паходжаннем, і Дамавіка. Часцей нябачны для людзей, але калі робіцца бачным, то ўяўляе сабою чалавекападобную масу, дзе праз сажу, пыльнае павуцінне ды наліплую мякіну нельга разгледзець яго асобныя формы. Ёўнік рупіцца, каб правільна палілася сушыльная печ і сушыліся снапы і зерне. Любіць, калі сушыльня замяняе лазню, і можна змыць з сябе сажу і пыл. Пры наведванні асеці непатрэбнымі асобамі палохае іх, а ненавісніка можа задушыць чадам ці нават спаліць разам з дабром. Каб залагодзіць Ёўніка, прыносяць яму ахвяру: пры наладжванні ёўні адзін сноп кідацюць у агонь, каб Ёўню "была занятка". Калі ж угняявіць яго, ён сам пачынае паліць снапы і ёўню.



# Баламуцень

- Вадзяны чалавек. Згадваецца ў Вілейскім раёне. Ва ўяўленнях маляваўся надзвычай неепрыгожым: галава яго нагадвала збан, твар такі азызлы, што амаль не відаць вачэй, гусіная скура, кароценькія, тоненькія і крывенькія ножкі, вялізны жывот. Халасцяк, пры гэтым вельмі любюіць жанчын. Пры набліжэні жанчыны ён паўстае перад ёй ва ўсім сваім харастве і напускае на абранніцу чары, і тая паслухмяна ідзе за ім. Баламуцень ніколі не бярэ жанчын назаўсёды, ён адпускае іх дадому, і яны набываюць здольнасць не тануць нават тады, калі б гэтага захацелі.



- Баламуцень

# Вадзянік

- Вадзяны дзед і інш.: у старадаўніх павер'ях многіх народаў дух—увасабленне стыхіі вады; уладар пэўнага вадаёма і жывых істот у іх. У беларускім міфалагічным светаглядзе — адзін з духаў падводнага гаспадарства.
- Вадзяніка звычайна ўяўлялі старога з зялёнай барадой, доўгімі валасамі, расплывістым тварам, укрытага водарасцямі і цінай. Лічылі, што вадзянік жыве ў вірах рэк, асабліва каля млыноў (такі зваўся «вірнік»), на дне азёр, крыніц, глыбокіх калодзежаў («ціхоня»). Яму прыпісвалі рух і памутненне вады, пару над ёй, разлівы рэк, псаванне рыбалоўных прылад, разбурэнне плацін, млыноў, гібель жывёл і людзей у вадзе.



- Вадзянік

# Лазнік

- Жыве ў лазні пад палком... Гэта злы дух, які выглядам нагадвае Вадзяніка.
- Лазнік любіць парыцца і мыцца; яму пакідаюць дзеля гэтага венік і ваду. Сваё мыццё ён робіць пасля апоўначы, а таму не любіць, каб хто-небудзь заставаўся да гэтага часу ў лазні. Калі ж хто застанецца так доўга, то Лазнік пачынае кідаць з печы камяні, намагаючыся забіць дзёрзкага.
- Лазнік больш злосны за іншых сядзібных нячысцікаў і цярпець не можа гультаёў, а тым больш - несвоечасовых наведвальнікаў, якіх палохае ненатуральным храпам, шыпеннем, паімённымі заклікамі, віскам, стукам у сцяну, варочаннем камянёў у лазні на каменцы, рогатам і інш. Зларадны рогат пужае запозненых у лазні жанчын, вымушаных уцякаць голымі. Ад пужання Лазніка не ўратавацца і тым, хто задумаў бы мыцца ў лазні пасля апоўначы: у іх ён кідае смеццем, нават камянямі, а пры вострым выпадку можа нават загубіць парушальніка спакою.



# Лесавік

- Абсяг дзейнасці - уся лясная плошча ад узлеску да ўзлеску, за выключэннем вадаёмаў, дзе маецца асобны нячысцік - Вадзянік. Дома не сядзіць - больш вандруе, адпачывае і начуе на вершалінах высокіх дрэў, у дуплах, густых зарасніках, у ламаччы, бураломах, у лагчынах і прадоннях. Хаця Лешы здольны прымаць розныя воблікі, ператварацца ў любыя прадметы свайго абсягу, але часцей за ўсё паўстае ў вобразе старога з белым, як бяроста ці як воск, тварам, з вялізнымі цьмянымі вачыма свінцова-сіняга колеру, якія нерухомыя і ніколі не заплюшчваюцца. Адны кажуць, што Лешы мае сплюшчаны, рабром наперад, доўгі твар, доўгую - клінам - бараду, адно вока і адну нагу пятою наперад. Калі ж ён ператвараецца ў звычайнага чалавека, то пазнаць яго можна толькі па тым, што левае крысо адзення ў яго будзе пакрываць правае, г.зн. зусім іначай, чым у хрышчоных людзей, а правае вока будзе нерухомае і заўсёды большае, чым левае.

- Лешы здольны перадаваць галасы ўсіх жыхароў свайго краю - ад мядзведжага рыку да піску камара ўключна; калі ж ён падае свой уласны голас, голас нябачнай істоты, то ці глушыць чалавека, ці лашчыць пяшчотным шэптам, каб выканаць мэты свайго каварства.

